■ Да ведама

ТЭХАГЛЯД — ПА НОВЫХ ПРАВІЛАХ

З 1 лістапада ўступілі ў сілу змяненні ў тэхнічны кодэкс усталяванай практыкі «Дзяржаўны тэхнічны агляд транспартных сродкаў. Парадак правядзення праверкі тэхнічнага стану транспартнага сродку».

У прыватнасці, устаноўлены новыя нормы і стандарты экалагічных патрабаванняў да рухавікоў. Для аўтамабіляў таксі распрацавана свая працэдура праходжання тэхагляду, а для ўладальнікаў мапедаў і квадрацыклаў праходжанне тэхагляду зроблена абавязковым.

— Галоўнае новаўвядзенне — для аўтамабіляў таксі зроблены больш жорсткімі патрабаванні да знешняга выгляду, стану салона і камплектацыі аўтамабіляў. Пад кантроль трапляюць апазнавальны ліхтар, палосы жоўтага колеру на бакавых паверхнях кузава, характэрны знак абслугоўвання, рэгістрацыйныя знакі, пасажырскія дзверы, проціадкатны ўпор, таксометр, механізмы рэгуліроўкі сядзенняў і спінак сядзенняў пасажыраў, стан салона, сядзенняў і іншага абсталявання, што знаходзяцца ў салоне транспартнага сродку, — паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Яшчэ адно новаўвядзенне: цяпер пры праходжанні тэхагляду будзе праводзіцца ацэнка шкоднага ўздзеяння транспартных сродкаў на навакольнае асяроддзе ў залежнасці ад прысвоенага ім экалагічнага класа, што ўказваецца ў рэгістрацыйных дакументах. Калі такая інфармацыя ў дакументах адсутнічае, ацэнка кантралюемых экалагічных параметраў будзе выканана згодна з гранічна дапушчальнымі значэннямі, указанымі ў дачыненні да транспартных сродкаў, аднесеных да першага экалагічнага класа. «Па сутнасці, нічога не змянілася, але калі раней значэнні гранічна дапушчальных экалагічных параметраў рухавікоў транспартных сродкаў рэгламентаваліся стандартамі СССР, дык цяпер у сілу ўступілі новыя стандарты, якія падзяляюць транспартныя сродкі на класы ў залежнасці ад ступені шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе».

Сяргей РАСОЛЬКА

«КАЛАСАВІНЫ» З ЗЁЛКАМІ

Мікалаеўшчына. Школьнікі дапамагаюць на пасадцы дрэў.

Смольня. Паэты-мікалаеўцы Алесь Камароўскі і Мікола Маляўка сярод землякоў каля ліп, пасаджаных Коласам 112 гадоў таму.

Могілкі «Церабяжы». Дырэктар музея Зінаіда Камароўская ўскладае кветкі на магілы Коласавай радні.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сустрэча з зямлёю Коласа заўсёды ўражвае і робіць сюрпрызы. У мінулую суботу надвор'е стаяла, нібы ў разгар бабінага лета, хоць лістапад, як правіла, самы «плаксівы» месяц. У Акінчыцах, адкуль заўсёды пачыналася вандроўка па зямлі песняра, прыгадаліся словы яго верша:

Пры шляху шырокім,
Дзе стаіць камора,
Я на свет радзіўся
Пад глухі шум бору...

А нам усміхалася пяшчотнае сонейка. І яшчэ кожны малюнак з экспазіцыі, створанай на акінчыцкай сядзібе. А госці з Мінска, Украіны і Расіі ўдзячна ўсміхаліся, слухаючы ўнука брата Якуба Коласа Юрыя Міцкевіча, які ведае «Новую зямлю» ад пачатку да канца і можа расказаць яе з любога месца.

— Якое ні было б надвор'е, у гэты дзень мы абавязкова ладзім паездкі па Коласавых мясцінах, каб аддаць даніну павагі і нашай шчырай удзячнасці славутаму земляку, — кажа дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Зінаіда Камароўская. — У першую чаргу — па мясцінах яго дзяцінства і сталення — Стаўбцоўшчыне.

Гэта ўжо 27-я «Каласавіны», якія ладзяць дырэктар і супрацоўнікі музея. Асаблівасць сёлетняга свята ў тым, што яно праходзіць у 90-ю гадавіну першага выхаду з друку паэмы «Новая зямля». Напярэдадні «Каласавін» было наладжана свята для дзяцей «Казкі жыцця» з удзелам дзіцячых пісьменнікаў. Потым прайшла 28-я міжнародная навуковая канферэнцыя «Зямля — аснова ўсёй Айчыне», прысвечаная славутай паэме. У ёй бралі ўдзел музейшчыкі трох братніх славянскіх краін — даўніх партнёраў музея Якуба Коласа. Удзельнікі канферэнцыі сталі і ўдзельнікамі свята ў Акінчыцах, Смольні, Мікалаеўшчыне і Альбуці.

У Смольні, дзе летась быў усталяваны памятны каменьвалун у гонар 100-годдзя з дня першай сустрэчы Якуба Коласа і Янкі Купалы і закладзены сквер «Дрэва жыцця», прысвечаны славутым імёнам Бацькаўшчыны, быў пасаджаны яшчэ адзін дубок — у памяць былога старшыні дабрачыннай рады музея, ураджэнца Стаўбцоўшчыны, шматгадовага загадчыка раённага аддзела культуры Анатоля Грэкава. Анатоль Васільевіч шмат рабіў для развіцця музейнай справы, звязанай з імем песняра, і карыстаўся вялікай павагай у жыхароў раёна. У тым, што сёння ў музеі функцыянуюць усе Коласавы сядзібы, створана мастацкая кампазіцыя «Шлях Коласа», немалая асабістая заслуга гэтага адданага рупліўца на ніве духоўнага адраджэння. На жаль, год таму яго не стала.

Вёска Мікалаеўшчына — сапраўдная літаратурная калыска. З гэтым куточкам прынёманскай зямлі назаўсёды звязаны славутыя імёны — Язэпа Лёсіка, Алеся Сянкевіча, Яўгена Хвалея, Міколы Дземідовіча... А таксама паэтаў Міколы Маляўкі і Алеся Камароўскага, якія ўзялі ўдзел у сёлетніх «Каласавінах» і чыталі перад землякамі свае вершы. Мікалаеўшчынскія школьнікі дапамагалі гасцям закласці рабінавую алею каля помніка песняру — пасадзілі 12 дрэўцаў у гонар землякоў-творцаў.

— Стварэнне «Хаткі знахаркі» ў Альбуці задумвалася даўно, а знаходжанне сядзібы Міхала-палясоўшчыка ў гэткім маляўнічым куточку якраз супадае з ідэяй адлюстравання ролі прыроды ў жыцці і творчасці песняра і яго сям'і, — сказала дырэктар музея Зінаіда Камароўская. — Вядома, што раней людзі лячыліся, а часам нават і ратаваліся зёлкамі, ведалі іхнія лекавыя ўласцівасці. Соф'я Міцкевіч ведае амаль усю «зялёную аптэку» тутэйшых лясоў і палеткаў і сама нярэдка карыстаецца ёю. Таму ёй і даверана стаць знахаркай і адначасова гаспадыняй альбуцкага фітабара.

Дзяды абавязваюць памятаць сваіх продкаў і славутых сыноў Бацькаўшчыны. Коласу наканавана было нарадзіцца амаль на Дзяды і па традыцыі-абавязку «Каласавіны» завяршаюцца ўшанаваннем тых, хто даў свету гэтага волата думкі і слова — Якуба Коласа. Могілкі, на якіх спачываюць амаль усе Міцкевічы і Лёсікі (па лініі маці песняра), здаўна называюцца Церабяжы.

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.

Акінчыцы. Выстаўка работ пераможцаў рэгіянальнага пленэру юных мастакоў «Дзе льецца Нёман срэбраводны».

■ Даты

На паштовых марках прыгоды Несцеркі, парасяці і іншых

У Нацыянальным прэс-цэнтры днямі адбылася цырымонія афіцыйнага гашэння паштовых марак, выпушчаных Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь і прысвечаных 40-годдзю айчыннага анімацыйнага кіно — у прыватнасці, васьмі самым папулярным і любімым фільмам. Сярод іх — «Воўк і баран», «Прыгоды Несцеркі», «Пра дзяўчынку Жэню», «Рыбка па імені «Нельга», «Піліпка», «Беласнежка і Алацвецік», «Прыгоды рэактыўнага парасяці», «Сараканожка».

Першы намеснік міністра культуры РБ Уладзімір Карачэўскі, памочнік міністра сувязі і інфарматызацыі краіны Наталля Аляшкевіч і генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алег Сільвановіч.

Гэты дынамічны, яркі і пазнавальны выпуск, паводле слоў дырэктара выдавецкага цэнтра «Марка» Ірыны Шыпілавай, выкліча непадробную цікавасць у дзяцей — найперш тых, што захапляюцца філатэліяй, у пасткросераў (людзей, якія абменьваюцца мастацкімі паштоўкамі). А яшчэ новыя маркі стануць яркімі экспанатамі ў прыватных філатэлістычных калекцыях.

Валянціна ДОЎНАР

■ Здарэнні

ІНСТРУКТАР «ПАД КАЙФАМ»

У дзяжурную часць Партызанскага РУУС сталіцы паступіла паведамленне, што ў раёне рухаецца «Опель Корса» з апазнавальным знакам «У», у якога спушчаны два пярэднія колы. Экіпаж ДАІ адразу ж адправіўся на пошукі.

Падчас гутаркі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі вызначылі, што 42-гадовы інструктар адной са сталічных аўташкол знаходзіцца ў стане наркатычнага ап'янення. Гэта пацвердзіў і сам кіроўца, тлумачачы, што ўжывае апіёйдны анальгетык і цяпер рухаецца на СТА. Аднак да пункта прызначэння ён не даехаў: мужчыну было прапанавана прайсці агляд ва ўстанове аховы здароўя. Пазней наркатычнае ап'яненне пацвердзіла і экспертыза. Інспектары высвятляюць, хто дапусціў выезд інструктара «пад кайфам» на службовым аўтамабілі.

Таццяна ТАЛЯРОНАК,
старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска.

■ Падрабязнасці

НА ПАЛЯВАННЕ, НА ЗАЙЦА!

2 лістапада ў краіне адкрыўся сезон палявання на зайца-русака і зайца-беляка з падыходу, з засады і загонам.

Паляваць дазваляецца на жывёлу любога полу і ўзросту зброевым спосабам (стрэльбы гладкаствольныя, патроны — са шротам) у светлы час сутак. Можна выкарыстоўваць паляўнічых сабак усіх груп. Таксама магчымы бяззброевы спосаб палявання — з хартамі і лоўчымі птушкамі. Доўжыцца сезон палявання будзе па апошнюю нядзелю студзеня.

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, зараз колькасць зайца-русака ў краіне складае 101,2 тысячы асобін, зайца-беляка налічваецца больш за 60 тысяч. У мінулым паляўнічым сезоне ў Беларусі было здабыта 37,6 тысячы зайцоў-русакоў і 6,4 тысячы зайцоў-белякоў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ Каштоўны прыток

«ЧОРНАЕ ЗОЛАТА» — З НОВАЙ КРЫНІЦЫ

Залеж нафты адкрылі беларускія геолагі ў Светлагорскім раёне. Па інфармацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, ён быў знойдзены ў выніку выпрабаванняў на Прохараўскім радовішчы (свідравіна Прохараўская 13).

Дэбіт па першых паніжэннях склаў 5 кубічных метраў бязводнай нафты за суткі, а з улікам рэзервуару залежу, што знаходзіцца вышэй, прадугледжваецца работа свідравіны фантанным спосабам.

— Дэбіт — гэта колькасць здабытай нафты. Менавіта столькі, 5 кубічных метраў (ці 5 тон),«чорнага золата» ўжо цяпер можна атрымаць з новай свідравіны цягам адных сутак, — патлумачыў Уладзімір Варакса, начальнік упраўлення па геалогіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Паводле яго слоў, 5 тон за суткі — не надта вялікая колькасць. У той жа час нафта з новай крыніцы з'яўляецца бязводнай, што гаворыць пра меншыя выдаткі на яе перапрацоўку ў будучыні.

Прохараўскае радовішча, на якім быў знойдзены новы залеж, знаходзіцца ў межах Паўночнай зоны Прыпяцкага прагіну, на тэрыторыі Гомельшчыны.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Шаноўную **Ларысу Паўлаўну ЮРЭВІЧ,** намесніка галоўнага ўрача па медыцынскай часці, сардэчна віншуем з днём нараджэння. Жадаем шчасця, здароўя, бадзёрага настрою, веры ў заўтрашні дзень, шырокіх дарог да працоўных перамог.

З павагай, калектыў медыка-санітарнай часці ААТ «МАЗ».

З БАЛКОНА ДЗЯВЯТАГА ПАВЕРХА — НА СЁМЫ...

Незвычайнае здарэнне адбылося ў доме па сталічнай вуліцы Сурганава: мужчына, які ўвечары знаходзіўся ў гасцях у кватэры сваёй знаёмай на дзявятым паверсе, ранкам «знайшоўся» на балконе жылля... на сёмым паверсе.

Падрабязнасці высвятляюцца. Пра здарэнне стала вядома са слоў дзяўчыны 1979 года нараджэння, якая ранкам убачыла свайго знаёмага на балконе кватэры двума паверхамі ніжэй (у самім гэтым жыллі нікога не было). Мяркуецца, што мужчына 1982 года нараджэння спусціўся з аднаго балкона на другі. Работнікі МНС устанавілі пнеўматычную выратавальную падушку «Куб жыцця», аўталескі і пад'ёмнік. Пры дапамозе апошніх мужчыну транспартавалі на зямлю. Ён не пацярпеў, толькі знаходзіўся ў стане алкагольнага і наркатычнага ап'янення. Выратаваны знаходзіцца на ўліку ў псіханеўралагічным і наркалагічным дыспансерах. Яго даставілі ў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя, дзе высветляць, чым было выклікана жаданне лазіць па балконам на вышыні.

Сяргей РАСОЛЬКА

На лёдзе было горача

Фота БЕЛТА.

Каманда Прэзідэнта Беларусі абыграла дружыну Мінскай вобласці ў матчы адкрыцця VII Рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі сярод аматарскіх каманд на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Гэта сустрэча прайшла на лёдзе крытага катка ХК «Юнацтва-Мінск» у Мінску ў парку імя Горкага. Каманда Прэзідэнта Беларусі — каманда Мінскай вобласці — 10:1.

■ Спорт-тайм

ЗАЦЯГНУТАЕ ЧЭМПІЁНСТВА

Нічыя БАТЭ з «Шахцёрам», пройгрыш па булітах мінскага «Дынама» і вікторыя валейбольнага «Нёмана» ў розыгрышы Кубка Беларусі па валейболе. Пра ўсё гэта і іншае чытайце ў чарговым спартыўным аглядзе «Звязды».

1. Барысаўскі БАТЭ ідзе насустрач чарговаму чэмпіёнству. Падапечныя Аляксандра Ермаковіча спадзяваліся менавіта ў гэтыя дні загадзя аформіць перамогу ў чэмпіянаце на хатнім стадыёне. Карацей, зрабіць свята родным заўзятарам, якія і так сёлета засталіся без еўракубкаў. І перадумовы для гэтага былі. Салігорскі «Шахцёр», яшчэ адзін з футбольных грандаў, апошнім часам выглядае няўпэўнена, праўда, пакуль трымаецца за другое — сярэбранае — месца. Аднак матч пайшоў не так, як хацелі гэтага барысаўскія гледачы. Гульня атрымалася багатай на галы і скончылася нічыёй — 2:2. За «жоўта-блакітных» трапнымі «стрэламі» адзначыўся Сяргей Крывец, у складзе «гарнякоў» двойчы вароты саперніка паразіў Дзмітрый Асіпенка. «У нас былі крыху іншыя планы, — пасля гульні адзначыў у размове з карэспандэнтамі Аляксандр Ермаковіч. — Хацелася стаць чэмпіёнам датэрмінова. Мы атрымалі другі мяч у свае вароты з-за страты канцэнтрацыі. Хочацца за гэта выбачыцца перад нашымі балельшчыкамі. У нас было жаданне парадаваць іх вынікам матча з «Шахцёрам». На жаль, не атрымалася».

Дэбют у Аляксандра Ермаковіча на капітанскім мосціку БАТЭ пакуль не суправаджаецца перамогамі. У мінулым туры барысаўчане саступілі гродзенскаму «Нёману», а цяпер вось не разабраліся з «Шахцёрам». Праўда, нягледзячы на гэта, няма сумневу у тым, што чарговая восень для БАТЭ зноў будзе залатой. У астатніх сустрэчах 29-тура зафіксаваны наступныя вынікі: «Гомель» — «Тарпеда-БелАЗ» — 1:2; «Дынама» (Мінск) — «Нёман» (Гродна) — 1:2; «Мінск» — «Белшына» (Бабруйск) — 2:3; «Дняпро» (Магілёў) — «Славія» (Мазыр) — 0:1; «Дынама» (Брэст) — «Нафтан» (Наваполацк) — 1:1.

2. Хакейнае «Дынама» ў Кантынентальнай хакейнай лізе не здолела на «Мінск-Арэне» перайграць «Адмірал» з Уладзівастока. Беларусы амаль увесь час лідзіравалі, але атрымалі на 48 хвіліне крыўдны кідок у свае вароты, і лік стаў 3:3. Лёс сустрэчы вырашыла серыя булітаў, у якой, дзякуючы аднаму трапнаму кідку Нікласа Бергфарса, вікторыю атрымалі госці. У выніку беларусы паклалі ў скарбонку 1 бал, «Адмірал» — 2. У Заходняй канферэнцыі мінчане займаюць 13-ы радок і пераганяюць толькі адну каманду — браціслаўскі «Слован».

3. Мужчынская зборная Беларусі па гандболе заняла 4-е, апошняе, месца на міжнародным турніры, які праходзіў у Тунісе. Спачатку падапечныя Юрыя Шаўцова мінімальна прайгралі тунісцам (25:26), пасля падзялілі балы з Бразіліяй (30:30) і саступілі зборнай Расіі (27:31). Адзначым, што пераможцай спаборніцтваў стала зборная гаспадароў, а нашы ўсходнія суседзі фінішавалі толькі на 2-й пазіцыі.

4. Баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск» добра праявіў сябе ў чарговым паядынку Адзінай лігі ВТБ. Перамогі не заваяваў, але на роўных гуляў з выдатным маскоўскім ЦСКА. Расіяне перайгралі беларусаў толькі ў чатыры балы (66:62). «Настрой на матч быў добры, — кажа Дональдас Кайрыс, галоўны трэнер «Цмокаў- Мінск». — І у нас атрымалася навязаць ЦСКА сваю гульню. Дзейнічалі кампактна, што дазволіла па балах блізка трымацца ад саперніка. Мы рэальна маглі перамагчы: нам няма чаго было губляць, а ў такой гульні няма фаварыта. На жаль, нашы сапернікі здолелі прыбавіць у вырашальны момант, мы — не». Пасля чатырох паядынкаў у групе «В» сталічная дружына займае 5 месца з 10 удзельнікаў. Свой наступны матч у міжнародных спаборніцтвах «Цмокі» правядуць ужо сёння. 5 лістапада на сваёй пляцоўцы ў межах турніру «Еўрачэлендж» яны прымуць румынскую каманду «Тыргу-Мурэш». Гульня пачнецца ў 19:00.

5. Жаночы клуб «Нёман-ГрГу» заваяваў Кубак Беларусі па валейболе. У фінале, які адбыўся ў Брэсце, дзяўчаты перамаглі «Жамчужыну Палесся» з Мазыра — 3:1. Віншуем!

Тарас ШЧЫРЫ

МІНСКІ КІНАФЕСТЫВАЛЬНЫ ШАРМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адна з такіх краін — Літва. Блізкая нам гістарычна і культурна. Яна яшчэ блізкая і дзякуючы асобам, напрыклад, такім, як Юозас Будрайціс. Легендарны акцёр савецкага кіно, народны артыст Літвы сёлета ўдзельнічаў у здымках беларускага фільма «Белыя росы-2». Але беларускія гледачы памятаюць і любяць яго па ранейшых працах у кіно. І менавіта за іх сёлета на «Лістападзе» яго ўшанавалі спецыяльным прызам Прэзідэнта Беларусі «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве». Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў уручыў прыз падчас урачыстага адкрыцця фестывалю.

— Я вельмі рады, што пазнаёміўся з Беларуссю і тымі людзьмі, з якімі я кантактаваў падчас здымак у фільме «Белыя росы», з некаторымі з іх, магчыма, мы пасябравалі на доўгія гады. Хачу падзякаваць за высокую ўзнагароду, за ацэнку маёй сціплай працы. Зычу «Лістападу» квітнець шмат гадоў. І каб пасля гэтага «лістападу» хутчэй распусціліся новыя лісты да наступнага.

Квітнець атрымліваецца: сёлета Мінскі міжнародны кінафестываль сабраў фільмы з 36 краін. Гэта чатыры конкурсныя праграмы, больш за 500 карцін. За 20 гадоў фестываль вырас у буйны форум дзякуючы перш за ўсё апантаным людзям, якія стаялі ля яго вытокаў. Ідэя мінскага кінафестывалю належыць прадзюсару і рэжысёру Сяргею Арцімовічу, які цяпер працуе ў Маскве. Але ён прыехаў на «Лістапад» у якасці аднаго з ганаровых гасцей і прайшоў па чырвонай дарожцы. Дарэчы, вельмі урачыстым было шэсце сям'і народнага артыста Расіі Мікалая Бурляева, які прыехаў у Мінск не адзін. Для яго «Лістапад» — сапраўды свята сямейнае, шмат гадоў ён прыязджаў сюды не толькі як удзельнік, а як сябар — «Лістапад» быў у цесных стасунках з фестывалем «Залаты Віцязь». Старшыня Міжнароднага кінафоруму «Залаты Віцязь» Мікалай Бурляеў сказаў:

— Я прысутнічаю на тым фестывалі, які для мяне неверагодна дарагі, таму што я быў адным з тых, хто закладваў першыя цагліны ў падмурак «Лістапада». Цяпер у праграме шмат новых краін прадстаўлена, у тым ліку заходніх. Але я вельмі строга стаўлюся да фестывальнага руху. Таму я вельмі хацеў бы, каб за гэтай цягай да таго, каб нас убачыў увесь свет, мы не страцілі самае галоўнае: душу. Дэвіз кінафестывалю — «Ісціна ў кіно». Я хацеў бы, каб гэтая ісціна сапраўды была ў тых фільмах, якія нам паказваюць. Я зычу ўсім радасці ад таго, што жыве кінематограф, хоць і ў складаных умовах. І дай Бог кінематаграфістам дапамагаць узвышэнню душы чалавека.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі гаворка заходзіць пра душу, то кожны найперш углядаецца ў сябе і прыслухоўваецца да свайго ўнутранага голасу. Як гэта робіць ганаровы старшыня «Лістапада», народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі, які ўзгадаў тыя гады, калі працавала дырэктарам «Лістапада» Валянціна Сцяпанава і калі фестываль напрацоўваў сабе імя:

— Мінску кінафестываль быў патрэбен. Тады быў час фестываляў: існаваў прэстыжны Маскоўскі кінафестываль, але разам з тым узніклі «Кінатаўр», «Кінашок», «Залаты Віцязь». Мы пачыналі сціпла. Але гэта быў фестываль добрага ва ўсіх сэнсах кіно. «Лістапад», калі казаць словамі пісьменніка Хэмінгуэя, — гэта свята, якое заўжды з намі. Таму што тут столькі добрага кіно, столькі цудоўных людзей — рэжысёраў, акцёраў, сустрэчы з якімі нясуць радасць.

Цяпер сапраўды можна ўзгадваць гады станаўлення фестывалю. І той час, калі патрабаванні пра смокінгі і гальштукі-матылькі ў вечаровых строях гасцей былі хутчэй з вобласці мараў: людзі найперш ішлі на фільмы, а не на свецкае мерапрыемства. Але гасцямі «Лістапад» не быў абдзелены ад пачатку — дзякуючы магутным акцёрскім дынастыям Янкоўскіх, Яроменкаў. І нягледзячы на тое, што сам конкурс быў не такі буйны па колькасці ўдзельнікаў, удалося галоўнае: зачапіць гледача. Цяпер у «Лістапада» іншы фармат і іншы маштаб. «На зорным небасхіле сусветных фестываляў мы ззяем не маленькай зоркай», — адзначыў старшыня кінафестывалю Генадзь Давыдзька. Два старшыні «Лістапада» распісаліся на талерцы, якую, у адрозненне ад мінулых разоў, не разбілі, а перадалі ў Музей кіно. Аднак і тут, як у кіно: талерка-дублёр усё ж была разбітая — дзеля таго, каб фестываль прайшоў паспяхова. Усё па-сапраўднаму. Як у кіно...

Ларыса ЦІМОШЫК.